Opłatę pocztową
uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

# ЖЫЦЬЦЁ БЕЛАРУСА

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 — 6. (Wilenska 12. m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзен. Адміністр. ад 9 да 3

Падпіска на адзін месяц з дастаукай да хаты 2 зл. Для заграніцы удвая даражэй.

**Перамена адрэса 30 грошы.**

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

№ 9. Вільня, Серада, 7-га кастрычніка 1925 г. Год I.

**СЯЛЯНЕ**! Памятайце, што **„Жыцьцё Беларуса“** — гэта **вашая газэта**, якая няухільна бароніць вашыя нацыянальныя і сацыяльныя інтэрэсы, а істнаваньне яе залежыць ад Вас. Дзеля гэтага **акуратна шліце падпісныя грошы.** Хто у цяжкую пару задоужыуся, хай цяпер, сабраушы з поля, **адашле свой доуг.**

## Работа „навыраст“.

У адным з апошніх нумароў перад сваей сьмерцяй эндэнцкі лейб-орган „Gazeta Warszawska“ надрукаваў дужа разумную і назьдзіў шчырую стацьцю пад загалоўкам „Nadmierny rozpęd“.

Зьмест гэтае знаменнае стацьці коратка перакажам.

Галоўная думка стацьці—тая, што польскі народ—ці, правільней, польская буржуазія распачала будаваць сваю дзяржаву такосказаць „навыраст“.—„У нашым гаспадарчым жыцьці—піша газэта — ў працягу некалькіх першых гадоў істнаваньня польскае дзяржавы паўстаў цэлы рад твораў, якія ня мелі належнага забясьпечаньня, належных падстаў... Таксама „разбудоўвалі“ нашае гаспадарства способам, які ня лічыўся з падставамі —гэта знача з фінансавымі магчымасьцямі“.

Прывёўшы далей рад прыкладаў, як у Польшчы тварыліся на шырокі маштаб такія галіны прамысловасьці, якія не маглі зусім разьлічаць на шырокі збыт сваіх вырабаў (прыкладам, будаваньне вагонаў), газэта кажа, што тое-ж рабілася і ў-ва ўсім дзяржаўным будаўніцтве. „Натварылі цэлую масу ўстаноў, якія ня могуць аплачывацца, або якіх няма з чаго аплачываць. Прыкра гэта казаць, але закладаліся нават школы, без якіх цяпер мы маглі-бы абыйсьціся. А перад усім прыймалі цэлыя масы ўрадоўцаў, для якіх няраз трудна было вышукаць работу. У выніку гэтага ў цэлым радзе ўстаноў не хватае грошы на тое, каб яны маглі карысна вясьці працу, дзеля якое створаны, але на пэнсіі для ўрадоўцаў грошы мусяць быць знойдзены“...

Гэты сьпісак можна прадоўжыць без канца. Можна прыпомніць і тое, што будаваньне польскага ваеннага флёту, які ў прыпадку вайны быў-бы ў вадзін міг пазбаўлены ўсялякае базы—з увагі на безбароннасьць „гданскага калідору“, — так сама нічым не апраўдана. І тыя заграічныя забавы і конскія скачкі, на якія на дзяржаўны кошт езьдзяць па ўсей Эўропе і трацяць вялізарныя сумы народных грошы польскія „героі-ездакі“. І многа-многа іншага, аб чым „Gaz. Warsz.“ і не ўспамінае, але залічае да *„фантазіі і маніі велічы“*.

„Манія велічы“ — „велькамоцарствовая ідэя“—вось тое, з чым жыцьцё цяпер прымушае Польшчу расстацца, як віцаць з стацьці эндэцкае часопісі.

Мы-бы хацелі адзначыць у гэтай „маніі велічы“ тое, што ня толькі пасрэдна, але і проста адносіцца да нас. Гэта — „велькамоцарствовая ідэя“ зрабіць з дваццацёх міліёнаў палякоў у Польшчы—адразу ажно трыццаць—коштам няпольскага насяленьня так-званых „крэсаў“, у першы чарод беларускіх і ўкраінскіх зямель, заваяваных Польшчай аружнай сілай. Калі палічыць, сколькі каштавала Польшчы аружная і дыпляматычная вайна за панаваньне над гэнымі „крэсамі“, колькі абыйшлося так-званае „паўстаньне“ на Горным Сьлёнску і „бунт“ генарала Жэліговскага, ды сколькі цяпер каштуе ўдзержываньне „крэсаў“ і апалячываньне іх,—дык акажацца, што ўсе гэныя выдаткі таксама перарасьлі фінансавыя магчымасьці Польшчы, асабліва з увагі на тое, што спадзяваных даходаў з „крэсаў“—за беларускія лясы, якіх нельга сплаўляць па Нёмне, ды за горна-сьлёнскае вугальле, якога не бяруць заграніцай, — дагэтуль усё яшчэ няма....

„Gaz. Warsz.“ ў сувязі з польскім дзяржаўным будаўніцтвам „навыраст“ піша:

„Нас чакае жорсткая праца, каб зьліквідаваць тое, што непатрэбна: жорсткая затым, што з гэтым зьвязана доля сотняў тысяч працаўнікоў“.

Вось-жа гэтая ліквідацыя павінна-б абняць ня толькі паасобныя галіны прамысловасьці ці паасобныя дзяржаўныя ўстановы, але і непатрэбныя галіны дзяржаўнага ўпраўленьня, а перад усім упраўленьня з цэнтру „крэсамі“ і вядзеньня палітыкі апалячываньня трацінь няпольскага насяленьня Польскае рэспублікі. Запраўды, як кожын дзень паказуе жыцьцё, у Польшчы няма ані матэрыяльных, ані інтэлектуальных сіл, каб давясьці да лёгічнага канца палітыку дэнацыяналізацыі беларусаў, украінцаў, літвіноў, жыдоў і немцаў.

Польскаму грамадзянству і польскаму ўраду трэба было-б паважна задумацца над тым, што многа год назад пісаў вядомы расейскі бюракрат, граф С. Ю. Віттэ, з прычыны расейскае нацыяналістычнае палітыкі (гл. яго „Воспоминанія“ ч. 2, стр. 239):

„Уся абмылка нашае многадзесятгадовае палітыкі — гэта тое, што мы дагэтуль яшчэ ня ўсьведамілі сабе, што ад часоў Пятра Вялікага і Кацярыны Вялікай нямашака Расеі, а ёсьць Расейская Імпэрыя. Калі каля 35 працэнтаў насяленьня—гэта інародцы, а расейцы падзелены на вялікарусаў, маларусаў і беларусаў, дык немагчыма ў XIX і XX вякох вясьці палітыку, не зважаючы на гэты гістарычны капітальнае вагі факт, не зварачаючы ўвагі на нацыянальныя асаблівасьці другіх нацыянальнасьцяў, што ўвайшлі ў Расейскую Імпэрыю,—на іх веру, іх мову і інш.

„Лёзунгам такое Імпэрыі ня можа быць: „зроблю ўсіх істінно-русскімі“. Гэты ідэал ня можа аб'яднаць ўсё насяленьне, стварыць адну палітычную душу. Мо' для нас, расейцаў, было-бы лепш, каб істанавала Расея, і мы каб былі толькі расейцамі, а ня сынамі супольнае для ўсіх Расейскае Імпэрыі. У такім выпадку *зрачыцеся акраін, якія ня могуць і не пагодзяцца з гэткім дзяржаўным ідэалам*“.

Ды рады найвыдатнейшага спаміж расейскіх бюракратаў царскіх часоў ніхто ў свой час не паслухаў, нацыянальнае палітыкі царскі ўрад не зьмяніў.... І прадбачаныя графам Віттэ з гэтае прычыны „великія потрясенія“ скончыліся запраўды ўтратай для Расеі найважнейшых па іх геаграфічнаму палажэньню і па іх багацьцю „акраін“—„крэсаў“.

Няўжо-ж у Польшчы ніхто ня бачыць— ці ня хоча бачыць—гэтае яркае лекцыі, дадзенае гісторыяй?!... А магутная-ж Расейская Імпэрыя, здаецца, не будавалася „навыраст“....

## Тактычнае значэньне „радавай неспадзяванкі“.

Міжнародава-палітычнае значэньне шахматнага ходу міністра замежных спраў ССРР—вельмі вялікае.

Усю справу трэба перад усім разглядаць у агульным пляне эўрапэйскай шахаўніцы дый у зьвязку з тым сусьветнага маштабу паядынкам, які ўжо два гады, усё завастраючыся, ідзе між Англіяй і ССРР—на ўсіх і ўсялякіх фронтах сьвету.

Англія, якой ССРР зрабіла вельмі небясьпечны і балючы шаг у Кітаі, падгатаўляючы неадхільны і аканчальны мат самым падставам яе імпэрыялізму ў Індыі, рашылася за ўсялякую цану і ўсялякімі способамі зваліць радавы ўрад, ці змусіць яго да зьмены варожай да Англіі палітыкі.

Каб доўга не развадзіцца, скажам коратка, што Англія, як звычайна, і цяпер хоча зваліць свайго ворага чужымі рукамі, — способам так-званай коаліцыі.

Усе спробы зрабіць гэта сіламі так-званай Антанты не далі ніякіх рэзультатаў. На доўгім і сумным досьледзе Англія пераканалася, што без Нямеччыны, якая тэхнічна памагае ССРР, зваліць радавы ўрад немагчыма. Але Нямеччыне, калі б тая згадзілася на гэтую роль, трэба перад усім вярнуць яе перадваенную палітычную і мілітарную сілу,—проці чаго дагэтуль пратэставала Францыя і ўсе яе васалы-новатворы, як Польшча, Чэха-Славакія і г. д.

Пакуль Англія з Францыяй спрачаліся аб гэтым, як Нямеччына, так і ССРР, адраджаючыся эканамічна і мілітарна, яшчэ адбудоўвалі сваю палітычную вагу і моц, астаючыся злучанымі Рапальскім саюзам, падтрымліваючы адна адну ў часы небясьпекі.

Дык тым балей для Англіі за ўсялякую цану трэба разьбіць гэты саюз ССРР з Нямеччынай, — тым балей, што Работніцка-Сялянская Расея пачала ўжо біць Англію і на яе ўнутраным сацыяльным фроньце, раскладаючы яе буржуазны лад, карыстаючыся магутнай, усё узрастаючай у краі арміяй безработных.

Гэтай палітыкай Англіі, ратуючай перад усім сябе, тлумачацца ўсе тыя катастрафічныя для францускага панаваньня ў Эўропе ўступкі, зробленыя Нямеччыне, — як рашучае абмежаваньне (амаль ня спыненьне) адшкадаваньняў („плян Доўса“), як зьняцьце акупацыі, запросіны ў Лігу Народаў, прыняцьце нямецкага праекту „Рэйнскага пакту“ і падгатоўленая рашучая ліквідацыя Вэрсальскага Трактату.

Як можна думаць, перад тым, як рашуча паставіць стаўку на Нямеччыну, Англія велікадушна прапанавала Польшчы „першую па блізкасьці да агня і па ліку ахвяраў—ролю“ ў праектаваным „крыжавым паходзе“ проці „вогнішча сусьветнай заразы“ — ССРР. Польшча і Румынія мелі быць базай для шырока задуманых апэрацыяў проці ССРР.

Але Польшча не адважылася на гэтую авантуру. Тады астаўся адзіны „варыянт“—нямецкі. За зваленьне бальшавікоў у Расеі Англія быццам гатова дазволіць Нямеччыне навет адбудаваць у сябе манархію. Бо ж—паглядзіце: насьледнік кайзэра з трыумфамі езьдзіць па Нямеччыне; Гіндэнбург займае становішча прэзыдэнта. Маршалак Фош 2 гадзіны канфэруе з сэкрэтаром нямецкага крон-прынца. Урэшце, ведамы генарал Гофман толькі што апублікаваў апрацаваны ім яшчэ 5—6 гадоў назад „плян зваленьня бальшавікоў“, дзеля чаго патрэбна толькі 100-тысячная добрая армія!..

Пад магутным націскам Англіі і Амэрыкі Францыя згадзілася на ўсе ўступкі Нямеччыне, каб толькі адцягнуць яе ад ССРР і ўцягнуць у Лігу Народаў. Але, з другога боку, на гэта патрэбна згода такжа і Нямеччыны. За гэтую згоду Нямеччыны Англія і Францыя суляць немцам Польшчу, жадаючы адначасна, каб Нямеччына адступілася ад саюзу з ССРР. Гэтага прынамся хоча і да гэтага змушае Нямеччыну Англія.

Гэткім чынам у Эўропе — у выніку гэткіх двух палітычных разводаў—апынуліся ў пэўным

адзінацтве „сэпаратка“ — Польшча і — здраджаны ці, маючы быць здраджаным — СССР... Дзіва, што з іх—мо‘ на якісь час — дзеля пацяшаньня, ці— „дыплематычнага“ націску на „няверных“ каханкаў—творыцца больш-менш чулая пара...

Абодвум новым каханкам навет часовая прыязьнь іх дае значныя, хаця і вельмі няроўныя, выгады. — Польшчы, прынамся на бліжэйшы час, гэтая „трывалая прыязьнь“ гарантуе—у піку і на злосьць Нямеччыне — польска-нямецкую граніцу, якую толькі што Англія з Францыяй „дазволілі“ Нямеччыне „грунтоўна пераглядзець“... На скіраваны проці СССР „заходні пакт“ СССР можа адказаць „усходнім пактам“, які для Нямеччыны усю вартасьць антанцкіх пасулаў зводзе да нуля. У выніку гэтага, калі б польска-радавы саюз стаўся канкрэтным фактам, Нямеччыне ня бачыць, як сваіх вушэй, ані Польскага Сьлёнску, ані „гданскага калідору“...

Што датычыць СССР, дык „трывалая прыязьнь“ з варшаўскай „разводкай“,—праўда, значна памятай францускім ваенным пастоем,—перад усім гарантуе яго ад усялякіх ангпійскіх ваенных авантураў, прынамся з захаду.—Проці волі Польшчы ніякога „крыжавога паходу“ проці СССР ня можна навет плянаваць, — тут нічога ня зробіць навет сам Макензон, ня толькі якісь там Гофман. Дык, прыкрыўшы добра і шчыльна свой заходні фронт, радавы ўрад можа спакойна заняцца ўсходнім—кітайска-індыйскім, на якім Англія чуе сябе найбольш нялоўка...

Можна сябе толькі запытацца, ці запраўды ўжо так далёка зайшоў гэты раптоўны флірт у Варшаве?!

Трэба думаць, што да запраўднага „саюзу“ яшчэ далёка Бо-ж мацнейшым старонам у абедзьвюх фліртуючых парах — як заходняй, таксама і ўсходняй—найвыгадней карыстацца ўсімі ласкамі і „wdziękami“ слабейшай стараны і — як найдалей цягнуць „флірт“, адцягіваючы мамэнт „шлюбу“...

Ня можа быць ніякага сумліву, што слабейшай—так сказаць, „жаноцкай стараной“—у гэтым „флірце з адчаю адзіноцтва“ зьяўляюцца Англія на Захадзе, Польшча на Усходзе. Дык яны і панясуць у канцы-канцоў усе „кошты“ гэтага флірту „на груба“, робячы сваім мілым ўсё большыя ўступкі...

А пакуль, што, як можна сцьвярдзіць, гэты флірт бясспрэчна карысны як для СССР, так перад усім і асабліва, як неспадзяваны ратунак, — для Польшчы. Трэба толькі памятаць, што гэты ратунак прыходзіць да Польшчы ў вельмі трагічны мамэнт яе міжнародава-палітычнай, фінансава-эканамічнай і ўсялякай слабасьці, блізкай да панічнага адчаю... Дык гэткі ратунак ня можа не ператварыцца—мягка кажучы—у залежнасьць.

Саўка.

# Важнейшыя здарэньні.

## У Польшчы.

### Пастановы Галоўнай Рады пэпэсаўцаў.

Галоўная Рада Партыі Польскіх Сацыялістаў, пасьля дыскусіі, прыняла рад рэзалюцыяў эканамічнага, сацыяльнага і палітычнага характару, якія прадстаўнікі партыі маюць правясьці ў жыцьцё ў начынаючайся сэсіі Сойму.

Паміж іншым пастаноўлена:

Пры фінансава-эканамічнай санацыі краю не дапусьціць адабраньня сацыяльных здабычаў у работніцкай клясы,—як 8-мі гадзінны дзень працы і г. д.

Не дапусьціць, каб пры гэтай санацыі Прэзыдэнт ці ўрад атрымаў новыя вынятковыя паўнамоцтвы, пазбаўляючыя законных правоў законадаўчыя палаты.

Адкінуць усялякія пляны ўраду адносна да падчыненьня дзяржаўнае гаспадаркі Польшчы чужаземнаму капіталу.

Пратэставаць проці крайняга пратэкцыянізму („падтрыманьня паноў прамыслоўцаў крэдытамі і забароннымі ўвознымі мытамі“), які стварае дарагоўлю прадуктаў сваей краёвай прамысловасьці.

Дамагацца нацыяналізацыі вугальнай і цукровай прамысловасьці, зьмяншэньня выдаткаў на войска, скарочаньня часу службы ў войску,—зьмяншэньня выдаткаў на дзяржаўную адміністрацыю (міністэрства ўнутраных спраў).

І так далей, і так далей—усё вельмі пекныя рэчы, толькі, як ведама найляпей самім пэпэсам, — у сучаснай Польшчы недасяжныя...

Уканцы ППС абяцуе разьвіць шырокую агітацыю за роспуск Сойму і новыя выбары паводле старога выбарнага закону.

Дык, відаць, трэба ўсе гэтыя рашучыя пастановы разумець, як падгатоўку да новай выбарнай кампаніі!

### Канец польска-жыдоўскага флірту..

Як і можна было легка прадбачыць, паны міністры Ст. Грабскі і Скшыньскі надулі па ўсей лініі жыдоў, з якімі—перад „выправай за залатым руном“ п. Скшыньскага — п. Грабскі заключыў урачыстую „транзакцыю“—аб прадажы жыдоўскай апазыцыйнасьці польскаму ўраду за рад салодкіх абяцанак...

П. Скшыньскі вярнуўся з Амэрыкі з пустым кішанем, як і паехаў—дык ня было-ж за што запраўды салодкія абяцанкі.

І вось толькі што ў соймавым „Жыдоўскім Коле“ ў Варшаве дасьпела да галасаваньня запрапанаваная п. Гартгласам рэзалюцыя гэткага зьместу:

„Урад ня толькі не датрымаў умовы, заключанай з Колам, але наадварот—яшчэ ўвеў рад новых абмежаваньняў для жыдоўскага насяленьня ў галіне нацыянальнай і прадаўжае надалей палітыку эканамічнага руйнаваньня жыдоўскага грамадзянства.. Дзеля гэтага Кола абвяшчае аб сарваньні паразуменьня з польскім урадам, лічыць апошняе абмылкай і пераходзіць ізноў у апазыцыю, зьмяняючы адначасна свой прэзыдыум...

### Падатак з маемасьці.

У прэсе былі весткі, быццам Грабскі рашыў у гэтым гадзе спагнаць за ўсялякую цану аж 900 міліёнаў злотых „маёнтковага падатку„. Заварушыліся ўсе ўласьнікі, націснулі на ўрад, і Грабскі быццам зьменшыў суму да 500 міліёнаў.

Але на апошнім паседжаньні фінансавай камісіі Сойму пастаноўлена, што і гэтая сума—не па сілам насяленьню, і рашыла яшчэ значна зьменшыць яе, бо—ўсе роўна не заплацяць: паны выкруцяцца—на „засадзе сьвятой ўласнасьці“, а рэшта насяленьня—бо ўся іх „сьвятая ўласнасьць ужо пайшла на падаткі за сябе і за паноў...

### Пачалася „парцэляцыя“...

У Малых і Вялікіх Астроўчыцах пачалася парцэляцыя фальваркаў абшарніка Радзівіла. На прыкладзе гэтай парцэляцыі відаць ясна, якая мае быць „зямельная рэформа“, дакананая абшарнікамі „дабравольна“... Радзівілаўскую зямлю атрымалі багатыры, чыноўнікі,—усе, хто хоча, толькі не мясцовыя малазямельныя сяляне.... Цікава, што гэты абшарнік Радзівіл ужо другі год як ня плаціць ніякіх падаткаў—дзеля таго, што яго маёнтку, як „ардынацыі“, урад ня мае права „сэквэстраваць“... Скардзіцца на якія-сь крыўды магутнага абшарніка і яго „афіцыялістаў“—ня прыходзіцца: паліцыя, адміністрацыя, зямельны ўрад — аднолькава бяссільны.. „Тут урадуе Радзівіл“, адкрыта кажуць запуджаныя ўрадоўцы.. „Работнік“.

### 191,810 безработных.

Безрабоцьце ў Польшчы катастрафічна расьце. Як сцьвярджае Дзяржаўная Біржа Працы, за тыдзень 12—19 лічба безработных павялічылася на 2.120 чалавек, і дайшла ўжо да агульнага ліку 191,810. За тыдзень 5 — 12 лік безработных павялічыўся на 1,420..

### Скандалы і арышты ў Лодзі.

Арыштаваны і пасаджаны ў вастрог віцэ-дырэктар тытуневай манаполіі ў Лодзі. Скампраметаваны ў надужыцьцях і сам пан дырэктар.

Арыштаваны таксама і дырэктар мясцовага Банку Хрысьцянскіх купцоў і прамыслоўцаў...

Працуюць паны дырэктары над адбудовай ўваскрошай Айчыны!

У ноч на 2 кастрычніка 4 азброенымі бандытамі ў масках аграблены каса Лодзінскага Магістрату. Слаўная польская паліцыя пэўна ж моцна спала пасьля доўгага працавітага дня — агледзіліся толькі раніцай...

# Лячэньне хворага злотага.

(Ад уласнага карэспандэнта).

I.

Прэм. Грабскі зрабіў колькі дзен таму назад журналістам вельмі цікавае экспозэ ў справе хворай польскай валюты—у зьвязку... з эканамічнай вайной з Нямеччынай.

Беларуская газэта ў свой час разглядала і прадбачыла страшэнна забойчыя для Польшчы, катастрафічна руйнуючыя адразу больш як палову яе ўвозу і вывазу, вынікі раптоўнага сарваньня тарговых зносінаў з Нямеччынай. Але, відаць, кіраўнік фінансава-эканамічнага жыцьця Польшчы, так лёгкамысна кінуўшы край у „ваенную авантуру“, толькі цяпер зразумеў усе няўхільнаканешныя вынікі яго кроку... Запраўды-ж цікава, каб не сказаць мацней, што толькі цяпер п. прэм‘ер знайшоў зусім натуральнае і чыста гаспадарчае тлумачэньне тым зьявішчам, якія ён тады, на пачатку „вайны“—у парыве „кавалерскай фантазіі“—кляйміў, як „нямецкую інтрыгу“..

Мы памятаем, што тады п. Грабскі тлумачыў нямецкую „атаку“ на польскі злоты так: выбраўшы добры мамэнт, Нямеччына адразу кінула на ўсе біржы сьвету вялізарную масу скупленай адусюль польскай валюты, ахвяраваўшы на гэтую апэрацыю вялікія грошы, каб толькі пашкодзіць Польшчы...

Цяпер п. прэм‘ер зусім проста і слушна кажа, што ўся тая маса польскай валюты ў Нямеччыне, якая дагэтуль была патрэбна нямецкім купцом і банкам для расплаты з польскімі імпортэрамі,—у выніку сарваньня тарговых зносінаў з Польшчай—аказалася зусім непатрэбнай, і ўвесь гэты мёртвы капітал адразу (гэта-ж і выклікаў сам п. Грабскі!) быў выкінуты Нямеччынай на рынак, а перад усім на галоўныя для Польшчы грашовыя рынкі (біржы) ў Бэрліне і Гданску, адкуль „зараза“—паводле закону „біржавой інфэкцыі“—з хуткасьцяй электрычнага току (тэлеграфам) перакінулася і на ўсе іншыя біржы сьвету...

Дык, калі гэта так пашкодзіла „непарушнасьці“ польскага злотага, на стабілізацыю якога п. Грабскі злажыў—коштам краю—гэтулькі страшэнных ахвяраў, аказаўшыхся ўрэшце выкінутымі надарма,—дык ясна, што вінаваты ў-ва ўсім той, хто, выклікаўшы ці прыняўшы „вайну“ з немцамі, ня ведаў тады, што рабіў...

П. Прэм‘ер у сваім экспозэ сам прызнаў тыя страшэнныя спусташэньні — фінансавыя, эканамічныя, палітычныя і маральныя, — якія ў краі і заграніцай выклікаў адносна да польскай дзяржаўнасьці паўторны спадак новай „стабілізаванай“—польскай валюты... Ён кажа, што гэтае паўторнае „заламаньне“ злотага ізноў абастрыла ў польскім грамадзянстве настроі „дэфэтызму“, ці „паражэнства“... Гэта — настрой няверы ў сілы Польшчы, у яе здольнасьць вытрымаць барацьбу з Нямеччынай, — наагул вытрымаць барацьбу ў гэткіх цяжкіх варунках і абставінах, дый яшчэ пад кіраўніцтвам такіх няздольных павадыроў... Як сцьвярджае галава польскага ўраду, польскае грамадзянства ахоплена няверай у фінансава-эканамічныя, дый палітычныя сілы і здольнасьці польскай дзяржаўнасьці,—ў маральныя сілы ўласнага духа... Адзін толькі яго павадыр і кіраўнік мае заўсёды непахільны оптымізм... Але слушна кажа мясцовая расейская газэта, што — дрэнна, калі адзін толькі павадыр арміі оптымістычна верыць у пабеду, а ўся армія настроена „дэфэтыстычна“... Бо-ж перамога залежыць ад маральнага духа арміі, а не ад кавалерскага оптымізму аднаго павадыра... Але яшчэ горш бывае тады, калі паражэнскі настрой у арміі ствараецца няверай яе ў свайго павадыра... Тады першым крокам для папярэджаньня раскладу арміі зьяўляецца... перамена павадыра!

І вось—большая палова польскай прэсы ўжо выразна зрабіла гэты неадхільны вывад:— Той міністар фінансаў, які галоўным пунктам сваей амбіцыі, галоўнай мэтай сваей дзеяльнасьці ставіў „аздараўленьне“ (санацыю) польскай валюты, павінен разам з упадкам гэтай валюты ўпасьці сам.

Польская прэса паведамляе, што ў Закапаным мае адбыцца зьезд прадстаўнікоў ствараючайся новай урадавай большасьці ў Сойме—з самым маршалкам Ратаем на чале. Гэты зьезд апрацуе дэтальна тактыку кампаніі проці прэм‘ера Грабскага і падрыхтуе склад новага ўраду, на чале якога мае стануць—той-жа самы марш. Ратай.

Але непапраўны оптыміст п. Грабскі таксама оптымістычна, як на польскія фінансы, глядзіць і на самога сябе, бачучы ў сваей асобе адзінага польскага фінансіста.. У размове з супрацоўнікам „Kur. Polsk.“ ён рашуча заявіў, што выхадзіць у адстаўку ня зьбіраецца, бо ня бачыць да гэтага ніякае падставы... Што-ж датычыць спадку злотага, дык гэта бывае з кожнай валютай, і з яго хваробы ён яго хутка вылячыць..

---

Дык вось запраўды-ж цікаўна прыглядзецца бліжэй да гэтай хваробы злотага і да пэрспэктываў яго вылячэньня, ці павароту да так званага „парытэту“ (пачатна ўстаноўленага нармальнага курсу—паводле золата).

Першым і галоўным фактам хваробы злотага, сцьверджаным у экспозэ прэм‘ера, зьяўляецца зьмяншэньне на цэлую трацінy таго аснаўнога і „нятыкальнага“ фонду Польскага Банку, якім было ад пачатку загарантавана здароўе польскай валюты (слова валюта і азначае—сілу, вартасьць, здароўе). Вось як аб гэтым зьмяншэньні „жыцьцёвай сілы“, ці „залатой крыві“ польскага злотага, кажа сам прэм. Грабскі („Robotn.“ № 236):

„Спадак пакрыцьця злотага з 60 працэнтаў да 39, а нават да 36%, змусіў Польскі Банк прыняць рашучыя і вельмі цяжкія для гаспадарчага жыцьця краю абмежаваньні ў справе крэдыту“. Дзякуючы гэтым забіваючым гаспадарчае жыцьцё краю мерам, кажа прэм‘ер, удалося нарэшце утрымаць „пакрыцьце“ на роўні 39%...

Што ж гэта значыць?

Перад усім сам п. Грабскі сцьвярджае тут агульна прызнаны факт, што яго „санацыя“ валюты гаспадарча забівае край.. Яго фінансавыя лекі забіваюць гаспадарча хворы арганізм краю... Далей, зьмяншэньне „пакрыцьця“ злотага значыць, што, калі спачатку Польскі Банк выпускаў свае „банк-ноты“ (злотыя) забясьпечанымі на тры пятых (на 60%) яго ўласнай маемасьцяй (золатам і чужымі валютамі), і толькі дзьве пятых кожнага „вэксэля“ (злотага) „пакрываліся“ сваім маральна-палітычным крэдытам Польскай Дзяржавы, дык цяпер „партфэль“ і склепы Польскага Банку нагэтулькі апусьцелі, што цяпер — наадварот: кожны злоты фінансава забясьпечаны маемасьцяй Польскага Банку толькі на дзьве пятыя (на 39%), напісанай на ім „вартасьці“, а рэшта—тры пятыя — загарантаваны толькі, так сказаць, маральна-палітычна—верай у Польскую дзяржаву...

Заўсёды бывае так, што, як толькі тая ці іншая грамадзкая ці палітычная ўстанова (а перад усім фінансавая) траціць часткова сваю рэальную вартасьць, пачынае вымагаць больш „ідэальнай“ веры ў сябе, тады якраз гэтая вера грамадзянства ў гэтую ўстанову пачынае хутка падаць... І сам п. Грабскі слушна сцьвярдзіў гэты сумны факт, кажучы аб упадку веры ў перамогу ў польскага грамадзянства, ахопленага настроямі „дэфэтызму“. Трэба дадаць, што гэтая вера падае нават шмат хутчэй, чым зьмяншаецца „рэальная вартасьць“ („пакрыцьце“) тэй ці іншай установы.. І яркі доказ гэтага выяўляе прыклад апошняй пазыкі

### Самазабойства паліцыянта.

У Вілейцы пакончыў жыцьцё паліцыянт Смільгін, з прычыны цяжкога матэрыяльнага палажэньня.

# Заграніцай.

### Канфэрэнцыя нацыянальных меншасьцей.

Швайцарская газэта „Journal de Géneve“ паведамляе, што 15 кастрычніка ў Жэневе мае адбыцца канфэрэнцыя прадстаўнікоў усіх арганізаваных нацыянальных меншасьцяў эўрапэйскіх дзяржаў. Канфэрэнцыя маніцца абгаварыць спосабы забясьпечаньня магчымасьці сужыцьця меншасьцяў з большасьцямі на падставе права.

### Канфэрэнцыя ў Люцэрне.

Назначаны на 5-га кастрычніка з'езд міністраў замежных спраў Англіі, Францыі, Бэльгіі, Італіі і Нямеччыны—ў справе „Рэйнскага пакту“ амаль не сарваны. Нямеччына, настрашаная варшаўскім візытам Чычэрына, высунула ізноў такія дамаганьні, якія ізноў рэзка былі адкінуты Брыянам. Нямеччына трэбавала скасаваньня пастановы Вэрсальскага Трактату аб адказнасьці аднэй Нямеччыны за выбух Вялікай вайны і... вольных рук на Усходзе.

Брыян заявіў, што на канфэрэнцыі ня можа быць перагляду Вэрсальскага Трактату. А калі немцы ня хочуць канфэрэнцыі, дык няхай яе і ня будзе. Тады немцы пад націскам Англіі заявілі, што гэта не дамаганьні, але толькі „тлумачэньні“. Цікава ўва ўсім гэтым, што рашучы тон Брыяна толькі прыкрывае поўнае адступленьне па ўсей лініі.

Апошнія газэты прынясьлі вестку аб тым, што канфэрэнцыя ў Люцэрне пачалася.

### Чэха-нямецкае паразуменьне.

Падсказанае Англіяй Бэнэшу паразуменьне Чэха-Славакіі з Нямеччынай, разьбіваючае Франка-Польска-Чэха-Славацкі саюз, ужо пачало рэалізавацца.—Нямецкі пасол у Празе прыбыў у Бэрлін для прадуступных інфармацыяў Штрэзэмана.

### Чычэрын у Бэрліне.

Проста з Варшавы Чычэрын паехаў у Бэрлін, дзе павінен, так сказаць, пажаць усё тое, што пасеяў у Варшаве. Бо калі ў Варшаве збожжа новага „паразуменьня“ толькі красавала, дык у Бэрліне адразу пачалі важыць яго практычны ўмалот.

Нямецкая прэса запраўды сцьвярджае, што ў варшаўскім флірце, апрача захопленых „ахаў“, „цалусаў“, можа яшчэ чаго троха вальнейшага, ні да чаго „паважнейшага не дайшло. Бяседы Чычэрына з Скшыньскім ня вышлі за межы праграмнай дыскусіі, але ніякіх навет усціпных дагавораў — на карысьць Польшчы — не заключана. Іншымі словамі Чычэрын прыехаў з Варшавы ў Бэрлін з зусім разьвязанымі рукамі. Разумеючы аднак-жа ўсю небясьпеку для нямецкіх відаў і апэтытаў радавай гарантыі для Польшчы, Штрэзэман карыстаецца з усей сваей дыпляматычнай штукі, каб аслабіць у вачох Чычэрына абгаваранае ўжо ў галоўнейшых рысах паразуменьне Нямеччыны з заходнімі дзяржавамі.

Але Чычэрын ня шмат паддаецца гэтаму пяяньню нямецкага салаўя і, як пішуць, трэбуе, каб Нямеччына рашуча выбрала — або Рапальскі Трактат, або новы „Рэйнскі пакт“ з ворагам Радаў Англіяй. Новы пакт з Англіяй і Францыяй яўна пярэчыць Рапальлі, дык і Рады ня будуць сябе зьвязаваць з Нямеччынай, як дагэтуль. Але з таго, што пішуць нямецкія газэты, можна заключыць, што Чычэрыну галоўна ідзе аб тое, каб Нямеччына ў сваей новай „англафільскай“ палітыцы не зайшла толькі да таго, каб перашкаджаць радавым інтарэсам у Азіі, ці іншымі словамі не памагала там Англіі. А другое, каб Нямеччына ні ў якім выпадку не абавязывалася прапускаць у часе вайны „на ўсходзе“ чужое войска праз сваю тэрыторыю. Іншымі словамі — каб Нямеччына, перад уваходам у склад Лігі Народаў, катэгарычна дабілася скасаваньня таго § 16, які прадбачыць гэты абавязак Нямеччыны. І можна быць пэўным, што ў гэтых галоўных пунктах паразуменьне між Радамі і Нямеччынай утрымаецца,—дзеля таго, што абодва гэтыя пункты — аднолькава карысны, як для Радаў, так і для Нямеччыны.

Каб мімаходам яшчэ раз ацаніць шчырасьць варшаўскага флірту, трэба ўцяміць сабе, што скасаваньне § 16 Вэрсальскага Трактату робіць Польшчу мілітарна зусім адрэзанай ад Францыі, дык касуе заразам франка-польскі ваенны саюз, аддаючы Польшчу цалком на ласку абодвух яе магутных суседзяў.

Дык дзіва, што, сьмяротна баючыся Нямеччыны, польскія эндэкі ўжо згары пішуць аб „злучэньні Польшчы з Расеяй — у Вялікія Усходня Эўрапэйскія Славянскія Штаты“.

Гэткім чынам новахрэшчаны эндэк Новачыньскі паўтарае той самы верш Пушкіна аб „славянскіх ручаёх у расейскім моры, які дагэтуль цытаваўся эндэцыяй, як прыклад і доказ—агіднага расейскага імпэрыялізму.

Практычны ўмалот з візыту Чычэрына ў Бэрліне не абыймаецца, відаць, аднэй палітыкай. Камісар фінансаў СССР Сакольнікаў заявіў, што яго ўрад вядзе перагаворы ў Бэрліне аб пазыцы ў 100 мільён. залатых марак на закуп у Нямеччыне сельска гаспадарчых машын.

Здаецца, аб тых-жа машынах, як аб „радавым пасагу“ польскай прамысловасьці, была мова і ў часе варшаўскага флірту.

---

Чычэрын паведаміў Маскву, што па ўсім галоўным пунктам дайшоў да паразуменьня з Штрэзэманам, і дзеля таго згадзіўся на заключэньне з нямецкім урадам таргovага дагавору.

### Радава-нямецкая гандлёвая ўмова.

Немцы згадзіліся на экстэрыторыяльнасьць 9 вышэйшых радавых урадаўцаў торгпрэдства ў Бэрліне і адпусьцілі крэдыты Радам у суме 100 міл. марак. Немцы згадзіліся на ўвоз з Расеі 40 000 сьвіней.

Абедзьве дзяржавы гарантуюць адна аднэй узаемнае падтрыманьне.

### Залагоджаньне англа-турэцкага канфлікту.

Дайшоўшы ўжо амаль не да выбуху запраўднай вайны спор Англіі з Турцыяй з-за Мосулу ў апошнія дні быццам неяк злагоджаны. Францыя, якой Англія шмат памагла ў справе душэньня сірыйскіх паўстанцаў, адудзячылася Англіі і запрапанавала свае пасярэдніцтва ў канфлікце.

Англія, якая вельмі хоча Мосулу, але яшчэ больш ня хоча—бо баіцца—вайны, дык гатова навет зрачыся Мосулу, каб толькі захаваць від „шляхотнага адступленьня“, з радасьцяй згадзілася на паразуменьне. Турцыя ўпорна і рашуча цьвярдзіць, што Мосул быў і астаўся турэцкім, і павінен быць перад усім ачышчаны ангельцамі. Што да нафты, дык яна ўжо аддана Амэрыцы, і паразумецца ў гэтай справе можна ўсім разам. Дык вось і прыйдзецца гордай Англіі выбірацца з Мосулу—пад тым ці іншым соусам, на якія такія мастакі францускія палітычныя кухары.

### Вайна ў Марокко.

Францускае агенцтва ўсё піша аб бясспынным францускім наступленьні і пасьпехах. Дзіўна толькі, як можна рабіць гэтае наступленьне ў часе пачаўшагася ўжо „пэрыяду дажджоў, які робіць усе дарогі непраежжымі. Хіба што—на аэрапланах.

Што датычыць гішпанцаў, дык высьветлілася ўся хлусьня іх штабу аб пасьпехах і пабедах. Рыфэны патапілі не адзін іх карабль, але цэлы дзесятак, дый — б'юць іх, як і білі дагэтуль.

### Заняцьце сталіцы Абд-Эль-Крыма.

Францускае агенства паведамляе аб тым, што сталіца Абд-Эль-Крыма Ажыдір занята францускімі войскамі. Але-ж само яно дадае, што баі яшчэ ідуць з пераменным пасьпехам.

Выйшла з друку і прадаецца ў Беларускай Кнігарні—Вільня, Завальная 7.

**„Гародніцтва“.**

Як трэба гаспадарыць на гародзе, каб мець ДОБРАЕ варыва.

ЦАНА 75 ГР.

---

польскага ўраду ў Амэрыцы, аб якой толькі цяпер апублікаваны вельмі цікаўныя даныя.

Перад усім выдавалася вельмі дзіўным, дзеля чаго Амэрыка адмовілася дадаць Польшчы рэшту папярэдняй пазыкі (15 міліёнаў), а дала новую пазыку ў суме 10 міліёнаў? Цяпер гэта ўсё—зусім ясна: новая „пазыка“— зусім не пазыка... З гэтых 10 міліёнаў даляраў Польшча ня мае права выдаць ніводнага цэнту: яны павінны спакойна і нятыкальна ляжаць у Польскім Банку, павялічываючы яго „даляравы фонд“ і тым самым — даверые да польскага злотага. Але, каб не рызыкаваць ні адным цэнтам з гэтых міліёнаў і з працэнтаў за іх, Амэрыка патрэбавала, каб ня толькі на ўсю гэтую суму, але нават яшчэ на цэлых паўміліёна больш (—бо аж на 10 з паловай міліёнаў) Польскі Банк вывез з Польскай Дзяржавы і зложыў у больш пэўнае месца—у рукі трэцяй, зусім пэўнай асобы (у Англійскі Банк у Лёндане)—запраўднага золата—з вельмі малых запасаў Польшчы.

Дык бачым, што гэтая амэрыканская „пазыка“ Польшчы—зусім фікцыйная і паможа трошкі падлячыць польскі злоты толькі дзеля таго, што, атрымаўшы 10 міліёнаў даляраў, Польскі Банк атрымаў ад амэрыканскага банку права лічыць і вывезеныя ў Лёндан 10 з паловай міліёнаў даляраў золата—таксама „сваімі“...

---

Прэм. Грабскі кажа ў сваім экспозэ, што найгоршыя часы фінансава-эканамічнага крызісу ў Польшчы—ўжо мінулі, і што ён хутка зусім вылячыць польскі злоты.

Але гэты оптымістычны пагляд—запраўды-ж можа адзінокі ў польскай прэсе...

У паважнай часопісі „Tygodnik Handlowy“ зьмешчаны вельмі цікавы артыкул, які даводзіць, што ня толькі „надыходзіць вялікі крызіс“, якога яшчэ ня было, але што наагул—ці лячыць злоты „грабскімі“ лекамі, ці не лячыць яго — для Польшчы ўсё роўна дрэнна...

„Факт няўхільнага крызісу, — кажа вельмі няветлівы да п. Грабскага артыкул,—вынікае беспасярэдня з барацьбы за курс злотага і... нашай уласнай, прашу ня гневацца, дурноты“... Гэты страшэнны крызіс выбухне з прычыны „вялікага грашовага галаду, якога дагэтуль, можа, нават і ня было“...

Аўтар кажа, што курс злотага можна бараніць—або на заграніччным фроньце, або на ўнутраным. Гэтая абарона валюты наагул зьмяшчаецца ў тым, што, калі на біржы курс спадае ніжэй нормы, дык урад кідае на тую біржу іншыя добрыя валюты і скупляе свой злоты. Але-ж ясна, што гэткае „лячэньне“ ня толькі не стварае ў злотым больш запраўднага здароўя, але, наадварот,—яшчэ адыймае ў яго апошняе, — бо далей высасывае з Польскага Банку яго запас чужых валютаў, якімі Банк забясьпечываў вартасьць злотага...

А дзеля таго, што патрэба гэткай „абароны“ злотага,—як кажа аўтар,—будзе істнаваць заўсёды (пры гаспадарчым крызісе і „пакрыцьці“ толькі на 40%), а з другога боку — што ня можна дапусьціць вычарпаньня фонду Польскага Банку, — выходзе, што „з дня на дзень можа наступіць катастрофа, банкруцтва цэлае Польшчы“...

І вось—каб закупаць добрыя—чужыя—валюты, Польскаму Банку трэба выкідаць на заграніччныя біржы вялікія масы злотага, што, зразумела, абніжае яго курс... А пасьля, каб „бараніць“ гэты курс на тым-жа замежным фроньце, трэба тыя-ж самыя добрыя валюты ізноў кідаць на біржы, каб выкупаць падаючы злоты... Вось тая „хітрая“, але, як бачым, зусім недарэчная „мэханіка“, ня якой палягае „інтэрвэнцыя“, ці „абарона“, злотага на замежным фроньце...

І ці-ж ня дзіўна, і ці-ж не забойча для Польшчы тое, што з двух фронтаў, на якіх можна весьці гэтую барацьбу, п. Грабскі выбраў якраз гэны—найбольш некарысны?! Чаму?, можна было-б запытацца. Таму, што гэты спосаб дае найхутчэйшыя, хоць, як бачым, зусім фальшывыя, — толькі „агітацыйныя“ рэзультаты. Гэткім спосабам быццам ратуецца на колькі дзён „прэсьціж“ і „крэдыт“ Польшчы заграніцай, ад якой Польшча, як дагэтуль, так і надалей, спадзяецца апоры, ігнаруючы адзіную запраўдную апору — у краі... „Абарона злотага“ абазначае няўхільны ўзрост дарагоўлі, зьмяншэньне грашовага абароту ў краі, зьмяншэньне і падаражэньне крэдыту і—далейшае завастрэньне гаспадарчага крызісу...

Але, — справядліва кажа аўтар артыкулу, — калі зусім пакінуць злоты яго лёсу на біржы, дык ён пачне падаць катастрафічна. Былі дні, калі ў Варшаве курс злотага ўпаў на 25 проц., ці на чверць яго вартасьці. Гэта-ж значыць, што кажды, хто мае злоты, адразу страціў чацьвертую частку свайго капіталу...

Дык вось якія пэрспэктывы „санацыі“ панам Грабскім яго злотага.—Або катастрафічнае зьмяншэньне колькасьці абароту злотага, масы якога патрэбны заўсёды Польскаму Банку для сталай „інтэрвэнцыі“ на біржах усяго сьвету—дзеля яго абароны,—(а гэта забівае край гаспадарча); або — зьмяншэньне, можа, яшчэ больш катастрафічнае,—вартасьці грашовага абароту ў краі, забіваючае яго яшчэ больш сьмяротна...

---

Артыкул пісаны 2 тыдні назад. Ад таго часу курс злотага значна пагоршыўся. Быў спадак такі, што даляр каштаваў каля 7 злотых. Цяпер пакуль што стаіць на 6 афіцыяльна і троха вышэй на вольным рынку.

Пасьля гэтага экспозэ прэм. Грабскі зрабіў яшчэ штось са два, да якіх мы яшчэ вернемся.

Выясьнілася яшчэ шмат цікавых фактаў і дэталяў з жыцьця польскай валюты, з якіх адзначаем пакуль што, як папраўкі і дадатак да артыкулу, наступныя.

1. Так-званая „пазыка“ амэрыканскага Рэзэрвнага Банку мела мэтай ня столькі памагчы польскаму злотаму, як — амэрыканскім купцам, прадаўшым Польшчы муку і іншыя тавары... Дык значная частка гэтых 10 міліёнаў даляраў „пазыкі“ і пайшла—міма Польскага Банку—проста ў кішані гэтых амэрыканскіх купцоў.

2. Ня гледзячы на тое, што ў Польшчы і так у 4—5 разоў менш грошаў у абароце, чым трэба дзеля нармальнага гаспадарчага жыцьця (толькі каля паўмільярда злотых), Польскі Банк—з прычыны зьмяншэньня свайго фонду—змушаны быў яшчэ зьменшыць гэты злотавы абарот у краі аж на два з лішкам дзесяткі міліёнаў злотых, ня гледзячы і на зьмяншэньне ў паўтара разы „пакрыцьця“ гэтых злотых...

3. У сувязі з гэтым грашовым голадам у краі пачалі высоўвацца розныя праекты „дадатковай“, ці „падсобнай“ валюты. Паважнейшая польская прэса слушна адзначае небясьпеку гэтае „двувалютнасьці“... Але-ж фактычна цяпер у Польшчы істнуюць ужо дзьве валюты — „банкноты“ і „білеты здавковыя“, (разьменныя знакі), што яшчэ значна пагаршае курс злотага.

4. Мы ўжо ня кажам тут аб запраўдным пачаўшымся ў Польшчы моры на банкі, якія цягнуць за сабой на той сьвет тысячы людзей, руйнуючы навет моцныя прамысловыя і тарговыя фірмы. Дайшло да таго, што польскі ўрад пастанавіў дзяржаўным крэдытам ратаваць найбольш салідныя банкі... Але—дзе ўзяць грошы на гэты „крэдыт“.

**Кондратовіч.**

Варшава.

